# Выбарная ардынацыя ў самаўрад

з прадмовай аб самаўрадзе і ягоным значэньні для Беларусаў.

Вільня, 1938 г.

Адбітка з часапісу „Хрысьціянская Думка“.

XIII

[illegible]ська державна
наукова бібліотека
916

Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 1.

~~33 220.~~

# *Самаўрад і яго значэньне для Беларусаў.*

*Ідэя самаўраду ў сучасным значэньні паўстала на пераломе 18 і 19 стаг., калі Вялікая Француская Рэвалюцыя кінула кліч вольнасьці, роўнасьці і братэрства. Ністожачы манархістычна-цэнтралістычную ўладу, цьвет тагочаснае інтэлігенцыі дайшоў да перакананьня, што лепшы будзе лад і дабрабыт, калі ўладу на мясцох будуць выконываць мясцовыя людзі. Галоўным імкненьнем піонэраў самаўраду было тое, каб парадку разьвіцьця дабрабыту пільнаваў не паліцыянт, ці які-небудзь урадавец прысланы ад цэнтральнае ўлады, але мясцовае грамадзянства, ці йнакш — свае людзі. Такім чынам аблягчаецца агульна-гаспадарственны адміністрацыйны апарат і жыцьцё грамадзян становіцца лягчэйшым, больш прадуктыўным, грамадзкім і дагаднейшым для разьвіцьця дабрабыту ў краі, бо людзі на мясцох лепш разумеюць мясцовыя патрэбы. Адначасна даецца гэтым магчымасьць ініцыятывы шырокім масам ў вырашаньні іхніх супольных справаў.*

*Самаўрады бываюць рознаякія (тэрыторыяльны, гаспадарчы, нацыянальны і інш.). Галоўным*

1244

*аднак з іх ёсьць самаўрад тэрытарыяльны, каторы і будзем тут разглядаць.*

*Тэорэтычна бяручы самаўрад ёсьць здэцэнтралізаванай гаспадарственнай адміністрацыяй, выконванай мясцовымі органамі, непадлягаючы іншым органам і самастойнай у граніцах закону агульнага праўнага парадку. Самаўрад ёсьць інстытуцыяй праўна-палітычнай застасаванай да практычных патрэбаў грамадзянства і гаспадарства.*

*Паводле абавязуючага цяпер у Польскай Рэспубліцы закону тэрытарыяльны самаўрад на вёсцы мае тры ступені: 1. грамадзкія (вясковыя) рады на чале з солтысам, 2. валасная (гмінная) рада на чале з старшынёй (войтам) і 3. паветавая рада (да нядаўна Соймік) і стараста, каторыя з боку гаспадарства (дзяржавы) выконваюць кантрольнанаглядную ўладу.*

*Воласьці пераважна абыймаюць абшар ад 375 кв. кл. да 80 кв. клм. з насельніцтвам ад 14.000 да 6.000 асоб. Кожная воласьць ёсьць самаўрадавай (самакіруючай) тэрытарыяльнай адзінкай з правамі праўнае асобы. Валасная рада: 1. кіруе маемасьцяй, даходамі і расходамі воласьці, 2. праводзіць і ўтрымлівае гмінныя дарогі, 3. закладае і ўтрымлівае прытулкі, 4. да яе належаць і справы электрыфікацыі, каналізацыі, вадаправодаў і інш., 5. падтрымлівае земляробства, промысел, рамясло, коопэрацыю, 6. пашырае духовую культуру, закладаючы бібліятэкі, чытальні, школы, народныя дамы і г. д.*

*Вясковая (грамадзкая) рада кіруе: маемасьцяй і даходамі грамады і яе грамадзкімі справамі*

*маючымі характар культурна-гаспадарскі, супрацоўнічаючы з воласьцяй.*

*З гэтага кароткага агляду вясковага самаўраду можна ўжо сабе прадставіць, якая сапраўды вялікая роля і значэньне самаўраду. І дзеля таго беларусы павінны на самаўрад, на выбары ў валасныя (гмінныя) рады, а перад усім на выбары ў рады грамадзкія і на выбары салтысоў зьвярнуць вялікую ўвагу. У гэтых усіх органах мусяць быць у нашым Краю мясцовыя беларускія людзі.*

*Праз самаўрад мы можам дамагацца беларускае школы, закладаць народныя дамы, бібліятэкі і ўводзіць у іх беларускія кніжкі і газэты, памагаць незаможным але здольным беларускім вучням і студэнтам, падтрымліваць разьвіцьцё мясцовага промыслу і коопэрацыю. Словам, праз самаўрад мы можам рабіць вялікую культурную і гаспадарчую работу.*

*Не адзін на гэта можа гляне вельмі крытычна, бо ўсю дзейнасьць самаўраду і самыя выбары кантралюе адміністрацыя і можа касаваць пастановы радаў, караць і звальняць солтысаў і рады развязваць. Так, але адміністрацыя рабіць гэта можа тады, калі ёсьць нейкая нефармальнасьць ці праступак з боку рады ці солтыса. Усю-ж вышэй пералічаную дзейнасьць можна і трэба праводзіць у нас згодна з абавязуючымі законамі і Польскай Канстытуцыяй, каторая пазваляе нам дамагацца і закладаць і беларускія школы, і коопэратывы, і народныя дамы, і бібліятэкі, пашыраць культуру, паляпшаць свае гаспадаркі, рамясло, промысел і г. д.*

*Бяручы пад увагу ўсё вышэй сказанае, а таксама тое, што самаўрад зьяўляецца вялікай школай*

*грамадзкага ўзгадаваньня, беларусы ўсімі сіламі павінны імкнуцца да таго, каб быць у самаўрадзе і адыгрываць належную ролю. Памятайма аднак, што самаўрад бубзе карысным тады, калі ў ім будуць працаваць і кіраваць ягонай работай адпаведныя людзі. Дзеля таго як у грамадзкія рады, так у валасныя і паветавыя, а перад усім на солтысаў і войтаў трэба выбіраць людзей чэсных, разьвітых, стойкіх мясцовых беларусаў, каторыя патрапілі-б бараніць інтарэсаў мясцовых жыхараў і працаваць для дабрабыту роднае Краіны.*

Я. НАЙДЗЮК.

---

# Выбарная ардынацыя ў самаўрады

*Закон аб выбарах грамадзкіх, валасных і паветавых радных з 16. VIII. 1938 г. (Dz. U. Nr. 63, poz. 481).*

*На беларускую мову пераклаў з паясьненьнем і практычнымі радамі Я. ПАЗЬНЯК*

## АГУЛЬНАЕ ПАЯСЬНЕНЬНЕ:

Гэты самаўрадавы выбарны закон з 16.VI.1938 году (Dz. U. № 63 poz. 481) аб выбарах грамадзкіх, валасных і паветавых радных будуе тэрытpredыяльны самаўрад **зьнізу ўверх** — пачынаючы ад вясковай грамады, праз валасную раду і канчаючы паветавай радай. Грамадзкія рады паўстаюць спосабам выбараў радных выбаршчыкамі **бяспасрэдна,** а валасныя і паветавыя рады — выбарамі радных спосабам **пасрэдным.**

Бяручы пад увагу гэтую конструкцыю будовы тэрыторыяльнай самаўрадавай цэласьці (адміністрацыйная самаўрадавая цэласьць зьмяшчаецца ў адным павеце) трэба ўсім выбаршчыкам найбольш зьвярнуць увагі на **выбары грамадзкіх радных,** якія зьяўляюцца пасьля **выбаршчыкамі валасных радных,** а валасныя радныя — **выбаршчыкамі паветавых радных.**

Пры перакладзе (з паясьненьнямі і практычнымі парадамі) гэтага выбарнага закону на беларускі язык, узяты пад увагу толькі тыя артыкулы закону, якія датычаць адміністрацыйнай арганізацыі воласьцяў нашага Краю (воласьці падзеляныя на грамады) і безпасрэдна, або пасрэдна адносяцца да выбаршчыкаў, не перадаючы артыкулаў закону, датычачы хвыключна выбарнай камісіі і улады надзорчай.

**Я. Пазьняк.**

# Выбары грамадзкіх радных.

## Выбарная сыстэма.

**Арт. 1.** Выбары грамадзкіх радных адбываюцца на аснове агульнага, тайнага і безпасрэднага галасаваньня на прозьвішчы (фаміліі) кандыдатаў, сьпярша належна паданых.

## Лік грамадзкіх радных.

**Арт. 2.** (1) Лік грамадзкіх радных устанаўляецца ў грамадах:

1) да 500 жыхароў — дванаццаць;
2) звыж 500—1000 жыхароў - шаснаццаць;
3) звыж 1000—1500 жыхароў — дваццаць;
4) звыж 1500—2000 жыхароў — дваццаць чатыры;
5) звыж 2000 жыхароў — трыццаць.

(2) Лік жыхароў устанаўляецца паводле запісаў насельніцтва, якое вядзе воласьць (гміна).

---

1) Гэты закон аб выбарах радных у самаўрадавыя грамады абавязуе на цэлай тэрыторыі Польскай Рэчыпаспалітай.

## Права выбіраньня.

Арт. 3. (1) Выбіраць мае права кожны польскі грамадзянін бяз розьніцы плоці, які мае права выбіраць у Сойм і прабывае на тэрыторыі грамады найменш год прад аб'яўленьнем выбараў.

(2) Вымога аднагодняга прабываньня не адносіцца да:

1) прабываючых на тэрыторыі грамады дзень прад аб'яўленьнем выбараў уласьнікаў або ўладароў нярухомай маемасьці, паложанай на тэрыторыі грамады;
2) умысловых і фізычных працаўнікоў, незалежна ад роду і характару выконыванай працы, што стаяць у службовых адносінах да дзяржаўнай або публічна праўнай інстытуцыі, жаўнераў сталай вайсковай службы, сьвецкага і законнага духавенства,—калі гэтыя асобы спаўняюць свае чыннасьці на тэрыторыі грамады і пасяліліся на тэй тэрыторыі дзень прад аб'яўленьнем выбараў;
3) сям'і асоб, абазначаных у пкт 2, што прабываюць разам у гаспадарскай супольнасьці.

Паясьненьне: 1) „польскі грамадзянін" — гэта ня значыць, што даная асоба мае быць польскай нацыянальнасьці; гэта абазначае, што даная асоба мае быць прыналежнай да польскай дзяржавы.

2) „бяз розьніцы плоці" — гэта абазначае, што маюць права ў выбарах і мужчыны і жанчыны.

3) „права выбіраць у сойм" — абазначае, што трэба мець поўныя 24 гады жыцьця.

## Права выбарнасьці.

Арт. 4. Права быць выбраным мае кожны грамадзянін, які мае права выбіраць, катораму за дзень прад аб'яўленьнем выбараў скончылася 27 гадоў.

## Выбарчыя вокругі.

Арт. 5. (1) Грамада можа тварыць адзін або некалькі выбарчых акругоў.

(2) Кожны выбарчы вокруг павінен тварыць адну безпрарыўную тэрыторыяльную цэласьць.

(3) Падзел на выбарчыя вокругі праводзіць паветавы стараста прад аб'яўленьнем выбараў, устанаўляючы для кожнага вокругу лік мандатаў залежна ад ліку насяленьня.

(4) Лік жыхароў у вокрузе ўстанаўляецца паводле валаснога сьпісу насяленьня.

(5) У грамадзе, падзеленай на выбарчыя вокругі, ня можа прыпадаць на адзін вокруг менш, як 2 мандаты.

## Аб'яўленьне выбараў.

Арт. 6. (1) Аб'яўляе выбары паветавы стараста, устанаўляючы дзень аб'яўленьня выбараў і дзень галасаваньня.

(2) Дзень галасаваньня ня можа прыпадаць у час земляробскіх у полі работ і ў час урачыстых сьвят.

Арт. 7. (1) Надзор над выбарчымі чыннасьцямі праводзіць тая ўлада, якая аб'яўляе выбары.

(2) Надзор дае права трэбаваць выясьнень-

няў, касаваньня супярэчных з законам пастановаў выбарчых камісіяў або пастановаў старшыні камісіі, а так жа касаваць або трэбаваць скасаваньня дагледжаных пахібаў.

## Выбарныя камісіі.

Паясьненьне: Гэты пададдзел артыкулаў перадаём у скарочаньні, выказваючы іх галоўныя пункты.

Арт. 8. Выбарныя камісіі ёсьць двайныя: грамадзкія і акружныя. Калі грамада не падзелена на вокругі, тады абыймае ўсе выбарчыя справы грамадзкая камісія. Старшыню камісіі назначае паветавы стараста з жыхароў данай грамады, а сябраў камісіі выбірае калегія валасной управы, так-жа з жыхароў данай грамады. Кандыдат на раднага ў той грамадзе ня можа быць ані старшынёй, ані сябрам выбарнай камісіі.

Арт. 9. Ад прыняцьця абавязку старшыні і сябры камісіі ніхто, без паважнай прычыны, адказацца ня можа. За няпрыняцьце гэтага абавязку гразіць кара ад 10 да 100 зл.

Арт. 10. Сябры камісіі выконваюць свае абавязкі бясплатна. Можна трэбаваць толькі звароту коштаў праезду.

Арт. 11. Разам з сябрамі камісіі назначаюцца і іх заступнікі, якія могуць бываць на ўсіх паседжаньнях камісіі, але галасуюць толькі тады, калі заступаюць няприсутных сябраў камісіі.

Арт. 12. Да важнасьці пастановы камісіі трэба прысутнасьці старшыні і 2 сябраў камісіі. Пастановы прыймаюцца большасьцяй галасоў.

**Арт. 13.** Выбарныя камісіі ліквідуюцца пасьля заканчэньня і ўправамацненьня выбараў.

## Сьпіскі выбаршчыкаў.

Паясьненьне: Гэты пададдзел перадаём у скарочаньні агулам, выказваючы галаўнейшыя чыннасьці.

**Арт. 14.** Сьпіскі выбаршчыкаў састаўляе войт. Калі грамада падзелена на вокругі, тады для кожнага вокругу мае быць асобны сьпісак. Найдалей 15 дня пасьля аб'яўленьня выбараў войт павінен пераслаць сьпіскі выбаршчыкаў старшыні грамадзкай камісіі.

**Арт. 15.** Аб'яўленьне выбарнай чыннасьці: За 18 дзён прад галасаваньнем войт аб'яўляе ў грамадзе мяйсцовым спосабам аб выбарах. У гэтым аб'яўленьні падае: 1) лік мандатаў у грамадзе; 2) падзел грамады на вокругі; 3) склад камісіі; 4) лік мандатаў у кожным окрузе; 5) памешчаньне, дні і гадзіны, дзе мае ўрадаваць грамадзкая камісія; 6) дні, гадзіны і месца аб'яўленьня сьпіскаў выбаршчыкаў і падаваньня рэклямацыяў ды паўторнага аб'яўленьня гэтых сьпіскаў; 7) дні, гадзіны і месца падаваньня кандыдатаў; 8) лік выбаршчыкаў, якія маюць права падаваць кандыдатаў у вокрузе; 9) месца, дзень і гадзіна галасаваньня; 10) зьмест артыкулаў 16 і 20 закону. Калі-б аб'яўленьне выбараў было ня так выкананае, дык гэта была-б падстава да выбарнага пратэсту.

## Аб'яўленьне сьпіскаў і рэклямацыі.

**Арт. 16.** (1) Сьпіскі выбаршчыкаў будуць абяўлены ў памешчаньні грамадзкай выбарнай ка-

місіі на другі дзень пасьля аб'яўленьня войтам выбараў безпрарыўна ў працягу 3 дзён, найменш праз 5 гадзін у дзень.

(2) Падчас аб'яўленьня сьпіскаў кожны грамадзянін, можа іх пераглядаць, рабіць з іх выпісы, а асобы, што маюць права выбіраць могуць падаваць у грамадзкія выбарныя камісіі рэклямацыі.

Арт. 17. (1) Рэклямацыі можна падаваць з прычыны: 1) прапушчэньня таго, хто мае права галасаваць, 2) упісаньня таго, хто ня мае права галасаваць.

(2) Рэклямацыя падаецца пісьменна, або вусна ў пратакол з выясьненьнем прычыны.

(3) Грамадзкая камісія разглядае рэклямацыю безадкладна; у патрэбе камісія можа трэбаваць прадлажэньня або дапаўненьня довадаў.

Арт. 18. Грамадзкая камісія, разгледзіўшы рэклямацыю з прычыны неўпісаньня ў сьпіскі таго, хто мае права галасаваць:

1) упіша ў сьпіскі выбаршчыкаў або 2) паведаміць асобу, няўпісаную ў сьпіскі, што рэклямацыю адкідае.

Паясьненьне: Гэты артыкул перадаём у скарочаньні

Арт. 19. Адносна рэклямацыяў з прычыны ўпісаньня ў сьпіскі асоб, што ня маюць права галасаваньня, камісія сьцьвердзіўшы факты, або выкасоўвае із сьпіскаў тыя асобы, або адкідае рэклямацыю і аб гэтым паведамляе заінтэрасаваных. Заінтэрасаваная асоба мае права падаваць у камісію ў працягу 2 дзён спраціўленьне і выясьненьне.

*Камунікат № 9 Беларускага Народнага Аб'еднаньня*

# На выбары

## ў тэрыторыяльны самаўрад!

Збуджаны да новага жыцьця, цьвёрда і настойліва йдзе Беларускі народ да сьвятлейшай будучыні і лепшае долі. Ён будуе новае жыцьцё. Думка жыць так, як жывуць усе культурныя народы, глыбака закаранілася ў беларускія народныя масы і кліча старэйшае і маладзейшае беларускае грамадзянства—сялян, работнікаў і інтэлігенцыю — да дружнай працы на роднай ніве.

Беларускія народныя масы разумеюць, што падставай існаваньня кожнага народу ёсьць яго собскае гаспадарчае і культурнае жыцьцё. Ведаюць так-жа, што Беларускі народ у гаспадарчым і культурным жыцьці адстаў ад другіх на-

ёў Рэчыпаспалітай. Гэткі самаўрад зьяўляецца першай публічна-праўнай — інстытуцыяй абароны інтарэсаў мясцовага насельніцтва, установай выяўленьня яго настрояў, а так-жа вялікай школай грамадзка-палітычнага ўзгадаваньня, установай грамадзка-гаспадарчага разьвіцьця і праваднікам шырокай зашкольнай народнай асьветы.

Выбары ў органы тэрыторыяльнага самаўраду, паводле абавязуючага самаўрадавага выбарнага закону, праводзяцца дваякім спосабам: у сельска-грамадзкія рады спосабам безпасрэднага галасаваньня, а ў валасныя і паветавыя рады — пасрэдна, праз выбарчыя калегіі. Дакладна аб выбарах і спосабах іх правядзеньня падае ведамасьці выданая пабеларуску брашура *„Выбарная ардынацыя ў самаўрады."*

Старшыня Рады Міністраў Рэчыпаспалітай 9 верасьня сёлета выдаў спэцыяльны загад, каб выбары ў самаўрады праводзіліся бяз ніякага націску з боку дзяржаўнай адміністрацыі і агулам каб точна адбываліся паводле выбарнага закону.

Выбары ў самаўрады маюць адбыцца ў сьнежні сёлета і ў пачатку 1939 году. У некаторых ваяводзтвах нашага Краю ўжо абвешчаны выбары сельска-грамадзкіх радных.

На выбары сельска-грамадзкіх радных беларускія выбаршчыкі павінны зьвярнуць асаблівую ўвагу. Гэта першая і вельмі важная ступень самаўрадавых выбараў. Ад гэтых выбараў цалком залежны рэзультаты выбараў валасных і паветавых радных.

Дык заклікаем беларускае насельніцтва прыняць актыўнае ўчасьце ў надыходзячых самаўрадавых выбарах. Усе на выбары! Беларускія радныя павінны заняць належнае месца *ў сельска-грамадзкіх, валасных і паветавых радах*.

Вільня, 25 лістапада 1938 г.

Прэзыдыюм Ц. К. Беларускага Народнага Аб'еднаньня.

(—) *Я. Пазьняк* (—) *Др. Ст. Грынкевіч* (—) *М. Дварэцкі*
Старшыня — Віцэ-старшыні

(—) *Інж. Ад. Клімовіч.* (—) *Я. Найдзюк.*
Скарбнік — Сэкратар

Беларуская Друкарня ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 1—2.

родаў.

Прыроднае імкненьне да шчасьлівай будучыні і лепшай долі, пры гэтым сьведамасьць падставы быту і яго сучаснага стану, панукаюць Беларусаў да дружнай і арганізаванай працы.

Гэтае імкненьне праяўляецца ў беларускіх масах што раз з большай сілай ужо некалькі дзесяткаў гадоў і дало вялікія плады.

Факты мінулых гадоў сьцьвярджаюць, што беларускія народныя масы здольныя тварыць сваю арганізацыю і ўмеюць арганізавана працаваць дзеля агульнага дабра.

БЕЛАРУСЫ! Пры адсутнасьці беларускіх гаспадарчых і культурных арганізацыяў мы мусім усю сваю грамадзкую ўвагу і энэргію сьціраваць на тэрыторыяльны самаўрад — у грамадзкія, валасныя і паветавыя рады.

Тэрыторыяльны самаўрад у Рэчыпаспалітай— гэта дзяржаўная арганізацыя мясцовага насельніцтва. Цяперашні самаўрад — сельскія-грамадзкія, валасныя і паветавыя рады— з адміністрацыйнай стараны зьмяшчаецца ў адным павеце і дзеля гэтага не абыймае патрэбаў цэласьці паасобных кра-

**Арт. 20.** (1) Грамадзкая выбарная камісія найпазьней 3-га дня пасьля тэрміну, прадбачанага ў арт. (1) зробіць у сьпісках выбаршчыкаў зьмены, што паўсталі з прычыны рэклямацыяў, ад таго часу сьпіскі выбаршчыкаў будуць прызнаны, аканчальна ўстаноўлены і ўжо тады ня можна ў іх рабіць ніякіх зьменаў.

(2) Галасаваць будуць мець права толькі тыя асобы, што ўпісаны ў аканчальна ўстаноўлены сьпісак выбаршчыкаў.

(3) У выпадку падзелу грамады на выбарныя вокругі, старшыня грамадзкай выбарчай камісіі перашле прад днём галасаваньня і пасьля апублікаваньня, аб якім кажа арт. 26, старшыням акружным выбарных камісіяў сьпіскі выбаршчыкаў даных акругоў.

## Падаваньне кэндыдатаў.

**Арт. 21.** У працягу 3 дзён пасьля аканчальнага ўстанаўленьня сьпісу выбаршчыкаў маюць права выбаршчыкі падаваць у грамадзкія выбарныя камісіі кандыдатаў на радных, якія адначасна зьяўляюцца і кандыдатамі на заступнікаў радных.

**Арт. 22.** Кандыдаты на родных павінны мець права выбіраньня і быць выбранымі ў каторым колечы вокрузе грамады. Кандыдаваць можна толькі ў адным вокрузе.

**Арт. 23.** (1) Сьпісак падаваных кандыдатаў павінен зьмяшчаць імя і прозьвішча, імя бацькі і маткі, век і месца прабываньня кожнага кандыдата.

(2) Кожны кандыдат павінен падаць на пісьме, або вусна ў пратакол выбарнай камісіі, што

Львівська державна наукова бібліотека
№ 916

згаджаецца кандыдаваць і мае права быць выбраным.

(3) Лік кандыдатаў на сьпіску павінен быць падвойнай колькасьці ўстаноўленых мандатаў у адным окрузе.

(4) Кожны сьпісак кандыдатаў павінен быць падпісаны або паданы асабіста ў пратакол выбарнай камісіі найменш дзесяцьмі выбаршчыкамі, якія ўпісаны ў сьпісак выбаршчыкаў данага вокругу.

(5) Кожны выбаршчык можа падпісваць, або вусна падаваць, сьпісак кандыдатаў, толькі адзін сьпісак.

(6) Пасьля падпісаньня сьпіску кандыдатаў ня можна ані зьмяняць ані ўпісаваць новых кандыдатаў.

(7) Здыйманьне подпісу выбаршчыкам з падпісанага сьпіску ня мае ніякага праўнага значэньня.

(8) Тыя, што падаюць сьпісак кандыдатаў, маюць вызначыць з паміж сябе даверанага дзеля паразумленьня з выбарнай камісіяй. Калі такога даверанага ня вызначаць, дык давераным зьяўляецца выбаршчык падпісаны першы на сьпіску.

Паясьненьне: Падчас выбараў выбаршчыкі могуць арганізаваць выбарныя камітэты, заданьнем якіх было-б усьведамляньне выбаршчыкаў аб законным паступаньні ў выбарнай дзейнасьці і падшуканьні добрых кандыдатаў на родных.

**Сьпісак кандыдатаў** на пісьме павінен быць гэтак напісаны:

**Сьпісак кандыдатаў на радных**
**у грамадзе Жылічы.**

Падпісаныя выбаршчыкі падаюць такіх кандыдатаў на радных:

1. Пётра Лукашык, сын Івана і Дароты, гадоў 28, пражываючы ў Жылічах.

2. Іван Базылюк, сын Сьцяпана і Анны, гадоў 32, пражываючы ў Сухім Бары.

3. Адам Сіняк, сын Паўла і Тафілі, гадоў 30, пражываючы ў Сарокішках.

4. Максім Галабурда, сын Міколы і Параскі, гадоў 42, пражываючы ў Бродах.

У залучэньні знаходзяцца 4 заявы кандыдатаў.

(Уласнаручныя і выразныя подпісы выбаршчыкаў, найменш 10 асоб, але не пашкодзіць, калі падпішацца 15—20 выраршчыкаў).

**(Форма заявы кандыдатаў)**

Ніжэй падпісаны Іван Базылюк, гадоў 32, сын Сьцяпана і Анны, пражываючы ў Сухім Бары, заяўляе гэтым, што згаджаецца кандыдаваць у грамадзкую раду ў Жылічах і мае права быць выбраным.

Жылічы дня . . . 1938 г.

Іван Базылюк

**Увага:** Згодна з абавязуючымі законамі Беларусы маюць права падаваць сьпіскі кандыдатаў, напісаныя пабеларуску. Сьпіскі кандыдатаў трэба рабіць у двух экзэмплярах. Адзін экзэмпляр першы падпісаны выбаршчык, які зьяўляецца давераным сьпіску, падае ў выбарную камісію і трэбуе, каб камісія на другім экзэмпляры сьпіску пацьвердзіла паданьне сьпіску кандыдатаў.

## Устанаўленьне кандыдатаў.

**Арт. 24. (1) Грамадзкая выбарная камісія правярае, ці паданыя сьпіскі кандыдатаў адказваюць правілам закону.**

**(2) Грамадзкая выбарная камісія можа заклікаць безпасрэдна, або праз давераныга таго вы-**

баршчыка, які падпісаў сьпісак кандыдатаў і праверыць уласнаручнасьць яго подпісу і можа прызнаць подпіс няважным, калі заклікканы ня зьявіцца ў тэрміне не карацейшым як адзін дзень.

### Грамадзкая камісія і кандыдатуры.

Арт. 25. Грамадзкая камісія скасуе кандыдата са сьпіску, калі няма яго правільнай заявы, або калі кандыдат ўпісаны ў сьпісак пасьля падпісаньня сьпіску.

Калі знайдуцца недакладнасьці ў сьпіску кандыдатаў, дык грамадзкая камісія пакліча даверанага і зьверне ўвагу на гэтыя недакладнасьці. Калі давераны гэтых недакладнасьцяў не паправіць, дык камісія ўняважніць сьпісак, або скасуе тых кандыдатаў, адносна каторых будзе непапраўлена недакладнасьць. Аб усіх сваіх пастановах у гэтай справе камісія паведамляе даверанага сьпіску.

Калі-б камісія безпадстаўна ўняважніла сьпісак, дык гэта было-б падставай для выбарнага пратэсту.

### Абвешчаньне кандыдатураў і тэрмін галасаваньня.

Арт. 26. Найпазьней за тры дні прад галасаваньнем выбарная камісія абвяшчае сьпіскі кандыдатаў на радных, падае дзень і час галасаваньня і падае месца дзе адбудзецца галасаваньне.

### Галасаваньне.

Арт. 27 і 28. Галасаваньне трывае ад 8 гадзіны раніцы да 6 гадзіны вечара без перарыву.

**Падчас праверкі выбарнай урны і галасаваньня могуць быць давераныя сьпіскаў кандыдатаў.**

Паясьненьне: З арт. 28 выбарнага закону павінны карыстаць выбарныя камітэты і пастарацца, каб у камісіі давераныя сьпіскаў кандыдатаў былі прысутныя ўвесь час галасаваньня.

**Арт. 29. Падчас галасаваньня ня можна ані ў памешчаньні выбарнай камісіі, ані на прасторы 100 мэтраў ад гэтага памешчаньня праводзіць ніякай агітацыі.**

**Увага:** Далей за 100 мэтраў ад памешчаньня выбарнай камісіі агітаваць можна.

**Арт. 30 і 31 Выбаршчык павінен мець свабодны доступ у пам. выб. камісіі. Выбарная урна прад галасаваньнем павінна быць праверана і замкнута. Урны ня можна адчыняць аж да канца галасаньня.**

**Арт. 32.** Галасаваньне адбываецца гэтак: Выбаршчык галасуе асабіста спосабам карткі. Карткі галасаваньня мусяць быць белыя і чыстыя. На картцы галасаваньня могуць быць кандыдаты надрукаваныя, або напісаныя выразна рукой. Можна картку з кандыдатамі прыносіць з сабой, або напісаць у памешканьні выбарнай камісіі, дзе павінен быць адпаведны куток, каб выбаршчык мог тайна напісаць кандыдата. У камісіі выбаршчык атрымлівае канвэрт і ўлажыўшы ў канвэрт свой голас — картку аддае яго камісіі, якая на вачах выбаршчыка ўкладае канвэрт з карткай у урну.

Можна галасаваць і яўна, падаючы кандыдатаў у пратакол камісіі.

Паясьненьне: Выбарныя камітэты павінны разьясьняць, што ў галасаваньні найлепш трымацца прынцыпу тайнасьці выбараў.
Картка галасаваньня павінна выглядаць гэтак:

**На радных:**

1. Пётра Лукашык
2. Іван Базылюк

**На заступнікаў радных:**

1. Адам Сіняк
2. Максім Галабурда.

Арт. 33, 34 і 35. Камісія можа ўстанаўляць тожсамасьць выбаршчыка, які прадстаўляе або дакумант, або двух сьведкаў.

Галасаваньне можа быць прарвана і адложана на другі дзень толькі з прычыны вышэйшай сілы — пр. пажару.

## Сыстэма галасаваньня

Арт. 36. Калі ў вокрузе вызначаны 2—3—4 мандаты, дык выбаршчык можа галасаваць толькі на аднаго кандыдата на раднага і аднаго кандыдата на заступніка.

У вокругах, дзе прыпадае больш як 4 мандаты, або ў грамадзе не падзеленай на вокругі — там выбаршчык можа галасаваць на радных за

чацьвертую часьць усіх мандатаў і на заступнікаў радных чацьвертую часьць.

Паясьненьне: Практычна выглядае гэтак: У данай грамадзе вызначана 16 мандатаў і грамада на вокругі не падзелена — тады выбаршчык галасуе за 4 радных і за 4 заступнікаў радных.

Арт. 37. Карткі галасаваньня не адпавядаючыя вымогам закону і не паводле закону напісаныя на іх кандыдатуры будуць няважныя і такі голас у падлічэньні галасаваньня не бярэцца ў лік важных галасоў.

### Вынік галасаваньня.

Арт. 38 і 39. Пасьля заканчэньня галасаваньня, безадкладна выбарная камісія лічыць галасы. Выбранымі раднымі прызнае тых кандыдатаў, якія дасталі найбольш важных галасоў, але найменш дзесятую часьць усіх важна галасуючых выбаршчыкаў. Калі будзе роўнасьць галасоў, дык рашае лёс, выцягнены старшынёй выб. камісіі. Гэткім спосабам устанаўляецца і выбар заступнікаў радных. Калі гэткім спосабам ня будуць выбраны ўсе радныя або іх заступнікі ў вокрузе, тады праводзіцца паўторнае — сьціслае галасаваньне. У паўторным — сьціслым галасаваньні выступаюць толькі тыя кандыдаты, якія дасталі найбольш галасоў. Калі ў першым галасаваньні выбраны які кандыдат на заступніка, дык у паўторным галасаваньні можна на яго галасаваць, як на раднага. Калі·б яго на раднага ня выбралі, дык ён астаецца заступнікам. У паўторным галасаваньні ўважаюцца выбранымі тыя кандыдаты,

якія дастануць найбольш галасоў, без увагі, якая будзе часьць усіх галасуючых. Паўторнае — сьціслае галасаваньне мусіць адбыцца найпазьней 7 дня пасьля першага галасаваньня.

### Выбары без галасаваньня.

Арт. 40. Калі ў вокрузе законна будзе паданы толькі адзін сьпісак кандыдатаў, тады галасаваньня ня будзе і ўсе паданыя кандыдаты будуць выбраны без галасаваньня.

### Аб'яўленьне вынікаў выбараў.

Арт. 41 і 42. Пасьля падлічэньня галасоў выб. камісія састаўляе адпаведны пратакол і наступнага дня пасьля галасаваньня падае да агульнага ведама мясцовым спосабам вынікі выбараў.

### Выбарныя пратэсты.

Арт. 43, 44, 45, 46, 47, 48 і 49. Калі выбары пройдуць не законна, выбаршчыкі могуць падаваць у паветавае староства выбарныя пратэсты, выяўляючы незаконную чыннасьць. Аб уневажненьні выбараў пастанаўляе паветавае староства.

Выбарны пратэст трэба падаць у працягу 7 дзён пасьля аб'яўленьня вынікаў выбараў, падпісаны найменш 10 выбаршчыкамі. Пратэст падаецца выбарнай камісіі.

# Выбары валасных радных

Арт. 50. Лік валасных радных устанаўляецца гэтак: а) да 5000 жыхароў — 12; б) ад 5000 да 10.000 — 16; в) звыш 10 000 — 20 радных.

Выбары валасных радных у воласьцях падзеленых на грамады праводзяцца пасрэдным спосабам, а ў воласьцях не падзеленых — беспасрэдна.

Паясьненьне: Дзеля таго, што на тэрыторыі заселенай Беларусамі воласьці падзеленыя на грамады, зьвернем увагу ў выбарным законе толькі на артыкулы, абавязуючыя ў воласьцях падзеленых на грамады.

Арт. 51. Выбары адбываюцца спосабам тайнага галасаваньня. Воласьць можа быць падзелена на вокругі і можа быць без падзелу на выбарныя вокругі:

I) Калі воласьць не падзелена на выб. вокругі, тады валасную раду выбірае валасная выбарная калегія, якая складаецца: а) з грамадаў, дзе ёсьць грамадзкія рады, усе грамадзкія радныя ўваходзяць у валасную выбарчую калегію; б) з грамадаў, дзе няма грамадзкіх радаў, уваходзяць у вал. выб. калегію дэлегаты ад 2 да 10, залежна ад ліку насельніцтва; в) з усіх грамадаў

воласьці ўваходзяць у вал. выб. калегію солтысы і падсолтысы. Дэлегаты ў валасныя выбарчыя калегіі ад грамады, дзе няма грамадзкай рады, выбіраюцца таксама, як і грамадзкія радныя.

II) Калі воласьць падзелена на выб. вокругі, дык валасных радных выбіраюць **акружныя калегіі**, якія складаюцца: а) з грамадзкіх радных таго вокругу, або дэлегатаў ад грамады, калі няма грамадзкай рады; б) з солтысаў і падсолтысаў тае тэрыторыі, якая абнята выбарным округам.

Арт. 53. **Права быць выбраным** валасным радным мае кожны грамадзянін (мужчына і жанчына), які прад аб'яўленьнем выбараў кончыў 30 гадоў жыцьця, прабывае на тэрыторыі воласьці і мае ўсе правы вымаганыя арт 3 гэтага выбарнага закону.

**Выбарныя вокругі** павінны тварыць адну непадзельную тэрыторыяльную цэласьць; грамада ня можа быць раздзелена ў два вокругі. На адзін вокруг павінна прыпадаць найменш 3 мандаты. Падзел робіць паветавы староста.

### Аб'яўленьне выбараў.

Арт. 54. Валасныя выбары аб'яўляе паветавы староста, якія апавяшчаюцца таксама, як і выбары грамадзкія, згодна з арт. 6 і 7 гэтага выб. закону.

Выбарныя камісіі для правядзеньня валасных выбараў арганізуюцца так, як і выб. камісіі ў выбарах грамадзкіх.

## Выбарныя сабраньні.

Арт. 57 і 58. Выбары валасных радных адбываюцца на спэцыяльных выбарных сабраньнях. Закон наказвае, каб войт паведаміў усіх сябраў выбарнай калегіі аб выбарным сабраньні найменш за 6 дзён наперад, падаючы лік мандатаў і падзел воласьці на вокругі.

Выбарнае сабраньне правамоцнае ў прысутнасьці большасьці законных сябраў выбарнай калегіі. Калі на вызначаны дзень не зьбярэцца патрэбная большасьць, тады не скарэй, як за 7 дзён павінна адбыцца паўторнае сабраньне выбарнай калегіі. Калі б і другі раз не зьявілася больш палавіны ўсіх сябраў выбарнай калегіі на выбарнае сабраньне, тады паветавы аддзел назначае тымчасовых валасных радных, якія будуць выконваць свае абавязкі датуль, пакуль выбарная калегія ня выбярэ радных.

## Сьпіскі кандыдатаў на валасных радных.

Арт. 59, 60 і 61. На валасных выбарных сабраньнях старшыня выб. камісіі сьцьвярджае ці ёсьць больш, як палавіна сябраў выб. калегіі і сьцьвердзіўшы гэткую большасьць заклікае сабраньне, каб у працягу аднэй гадзіны часу падалі сьпіскі кандыдатаў на валасных радных. Сьпіскі кандыдатаў на валасных радных павінны быць падаваныя згодна з вымогамі арт. 22 і 23 гэтага выб. закону.

Выбарная камісія законна паданыя сьпіскі кандыдатаў аб‘вяшчае і аб‘яўляе галасаваньне.

## Галасаваньне.

Галасаваньне адбываецца таксама, як і ў выбарах грамадзкіх радных згодна з арт. 27—34 гэтага выб. закону. Апрача гэтага сябра выбарнай калегіі можа галасаваць на столькі кандыдатаў, колькі радных выбірае дадзены выбарны вокруг. Пры гэтым сябра выбарнай калегіі можа галасаваць ня толькі на кандыдатаў аднаго сьпіску, але і выбіраючы з многіх сьпіскаў па адным і больш.

Пасьля галасаваньня выб. камісія безадкладна падлічае галасы Пры падлічэньні галасоў і падчас галасаваньня маюць права быць даверанымя сьпіскаў кандыдатаў.

## Выбары без галасаваньня.

Выбары без галасаваньня адбудуцца тады, калі будзе паданы толькі адзін сьпісак кандыдатаў у падвойным ліку мандатаў у вокрузе.

## Выбарныя пратэсты.

Выбарныя пратэсты падаюцца супроць валасных выбараў таксама, як і супроць выбараў грамадзкіх, згодна з арт. 43—49 гэтага выбарнага закону.

# Выбары паветавых радных

Выбары паветавых радных адбываюцца тайным галасаваньнем. Выбірае **выбарная калегія**, якая складаецца: а) з валасных радных, б) сябраў валасных урадаў, в) з радных і сябраў урадаў местаў, каторыя ня выдзеленыя з павету.

**Лік паветавых радных** прыпадае на кожную валасьць да 10.000 жыхароў — 2 пав. радных.

Выбары адбываюцца або ў аднэй воласьці, або паветавы стараста на выбары можа злучыць некалькі валасьцяў. Аднак ня можа быць воласьць разьдзелена і прыдзелены яе часьці да другіх выб. калегіяў.

**Паветавым радным** можа быць кожны грамадзянін, які прабывае на тэрыторыі павету і мае ўсе правы вымаганыя законам быць валасным радным. Апрача гэтага мусіць умець гаварыць і пісаць папольску.

**Паветавыя выбары** аб'яўляе ваявода. Пасьля паветавыя старасты паведамляюць валасьці колькі, калі і дзе валасныя калегіі павінны выбраць паветавых радных. Войт за 7 дзён прад выбарамі паведамляе ўсіх законных выбаршчыкаў.

**Выбарчая камісія** складаецца з старшыні і 2 сябраў. Старшынёй камісіі—войт, а сябраў выбірае выбарная калегія.

## Кандыдатуры.

Калі калегія мае выбіраць 2 паветавых радных, дык падаюцца кандыдатуры на павет. радных асабова — без сьпіскаў. Калі калегія выбірае 3 павет. радных, тады падаюцца сьпіскі. На паданьне кандыдатуры і сьпіску кандыдатаў на павет. радных абавязуе тое-ж правіла, што і на валасных радных. Падаць кандыдатуры на 2 х радных і сьпісак кандыдатаў могуць 6 тая часьць усіх сябраў выб. калегіі ў аднэй воласьці, а ў калегіі некалькіх воласьцяў 8 ая часьць усіх сябраў данай выб. калегіі.

На доказ уменьня гаварыць і пісаць папольску даволі прадставіць сьцьверджаньне, што кандыдат хадзіў 3 гады ў школу, дзе вучылі папольску, або напісаць прад старшынёй выб. калегіі некалькі слоў папольску; пры гэтым правапісныя абмылкі не бяруцца пад увагу.

## Галасаваньне.

Галасаваньне адбываецца паводле арт. 27—35 гэтага выб закону, таксама, як у грамадзкіх выбарах. Зьмена ёсьць такая:

1) Выбіраючы 2 пав. радных выбаршчык галасуе толькі на аднаго кандыдата. На картачцы галасаваньня піша толькі аднаго кандыдата.

Выбраным ёсьць той, што дастане найбольш галасоў, але найменш 5-ю часьць галасоў важных.

2) Выбіраючы 3 пав. радных і больш абязуе правіла галасаваньня не сьпіскі, т ксама, як у выбарах валасных радных.

Вынік галасаваньня ўстанаўляецца таксама, як у выбарах валасных радных.

Выбарны пратэст апіраецца на тых самых правілах, што і ў выбарах грамадзкіх.

Усялякія пісьмы ў справах выбараў грамадзкіх, валасных і паветавых аплаце штэмплёвай не падлягаюць.

Усе папярэднія законы аб грамадзкіх, валасных і паветавых выбарах трацяць абавязуючую сілу.

---

(35 к.)
(1986) 0,93 коп
РЛ 916 У
66,10
1244
33220.

# Выбарная ардынацыя ў самаўрад

з прадмовай аб самаўрадзе і ягоным значэньні для Беларусаў.

Вільня, 1938 г.

Адбітка з часапісу „Хрысьціянская Думка".